Мазоўка М.І.

# ПЕДАГАГІЧНАЯ ПРАКТЫКА ЯК СРОДАК ФАРМІРАВАННЯ ПРАФЕСІЙНЫХ УМЕННЯЎ БУДУЧЫХ ВЫХАВАЛЬНІКАЎ

Заснавальнікамі тэорыі і практыкі прафесійна-педагагічнай адукацыі ў нашай краіне былі Н.К.Крупская, П.П.Блонскі, С.Т.Шацкі і інш. Яны распрацавалі патрабаванні, якім павінна адпавядаць сістэма падрыхтоўкі настаўніка. Вялікі ўклад у рашэнне гэтай праблемы зрабілі А.С.Макаранка і В.А.Сухамлінскі. Яны вызначылі шляхі ўдасканалення педагагічнага майстэрства. Многія вучоныя працуюць над зывучэннем праблем прафесійна-педагагічнай адукацыі: В.А.Абдуліна, В.В.Драгунова, Н.Б.Кузьміна, Н.В.Кухараў, А.І.Кочатаў, Я.Л.Каламінскі, А.В.Пазняк, К.Е.Прахава, Л.А.Панько, В.А.Сласценін, Л.Г.Семушына, А.І.Шчарбакоў і інш. У працах гэтых вучоных выдзяляюцца асноўныя педагагічныя ўменні, вызначаюцца ўзроўні іх развіцця, паказваецца роля педагагічнай практыкі ў фарміраванні асноў прафесійнага майстэрства. Зыходзячы з аналізу літаратуры можна зрабіць вывад, што фарміраванне прафесійных уменняў будучых выхавальнікаў заснавана на неразрыўным адзінстве тэорыі і практыкі навучання.

З усіх форм арганізацыі вучэбнай працы ў педагагічным вучылішчы, найбольш моцнае ўздзеянне на працэс фарміравання педагагічных уменняў аказвае педагагічная практыка. Яна з'яўляецца сувязным звяном паміж тэарэтычнымі ведамі навучэнцаў педагагічнага вучылішча і іх будучай самастойнай працай у дашкольнай установе. Практыка садзейнічае адаптацыі навучэнцаў да педагагічнай дзейнасці, стварае спрыяльныя ўмовы для выканання актыўных прафесійных дзеянняў і ўзбраення навучэнцаў першапачатковым вопытам выхавальніка-прафесіянала. У перыяд педагагічнай практыкі ажыццяўляецца праверка тэарэтычнай і практычнай падрыхтоўкі навучэнцаў да самастойнай працы, а таксама ствараюцца магчымасці для ўзбагачэння творчага патэнцыялу асобы будучага выхавальніка. Педагагічная практыка дапаўняе і абагачае тэарэтычную падрыхтоўку навучэнцаў, стварае ім магчымасць для замацавання і паглыблення атрыманых ведаў. На практыцы навучэнцы могуць выкарыстаць тэарэтычныя веды для рашэння практычных задач. На працягу практыкі ажыццяўляецца фарміраванне прафесійных уменняў і навыкаў. Навучэнцы вучацца:

а) аналізаваць усе бакі вучэбна-выхаваучай працы, знаходзіць

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

найбольш аптымальныя шляхі яе ўдасканалення;

б) выконваць назіранні за ўсімі дзецьмі і кожным асобным дзіцем (састаўленне характарыстыкі);

в) выяўляць веды і ўменні дзяцей шляхам выкарыстання розных методык педагагічнага даследавання;

г) планаваць змест педагагічнай дзейнасці на вызначаны адрэзак часу з улікам сваіх назіранняў;

д) арганізоўваць усе віды дзейнасці з дзецьмі ў дашкольных установах;

е) працаваць творча, выкарыстоўваць розныя спалучэнні метадаў і прыёмаў навучання і выхавання для дасягнення пастаўленых мэт;

ж) праводзіць работу з бацькамі дзяцей;

з) пераносіць тэарэтычныя веды на практыку і інш.

Педагагічная практыка з'яўляецца сур'ёзным выпрабаваннем для большай колькасці навучэнцаў. Як паказалі вынікі аналізу анкет, толькі 11% выпускнікоў Мінскага педагагічнага вучылішча N 1 не адчувалі цяжкасцей у выкананні праграмы практыкі, а асноўная колькасць навучэнцаў мела розныя цяжкасці: у правядзенні заняткаў з дзецьмі - 19%; у арганізацыі рэжымных момантаў - 13%; у арганізацыі гульнёвай дзейнасці - 16%; у рашэнні розных канфліктных момантаў у паводзінах дзяцей - 26%; у арганізацыі работы з бацькамі - 36%; ва ўстанаўленні ўзаемаадносін з выхавальнікамі. Пералічаныя цяжкасці не даюць нам падставы зрабіць вывад, што навучэнцы не мелі адпаведных ведаў, таму што ў адказе на пытанне: якая дапамога ім больш за ўсё была патрэбна на практыцы - 23% навучэнцаў жадалі атрымаць проста парады, што і як лепей зрабіць, 11% - не патрабавалі ніякай дапамогі, а астатнія выдзялялі канкрэтныя напрамкі дзейнасці. Часцей за ўсё эфектыўнасць педагагічнай практыкі вызначаецца ўзроўнем яе арганізацыі і кіраўніцтва. У гэтай сферы ўсё яшчэ працягваюць дзейнічаць дзве тэндэнцыі: першая - празмерная апека практыканта, другая - поўная свабода практыканта ад дапамогі кіраўніка. І першая, і другая тэндэнцыі ў кіраўніцтве накладваюць свой адбітак на якасць падрыхтоўкі будучых выхавальнікаў. Аднак гэта не памяншае значэння педагагічнай практыкі ў фарміраванні прафесійных уменняў і развіцці навыкаў педагагічнай дзейнасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ



Бахтурына Л.А.

## УДАСКАНАЛЕННЕ САМАСТОЙНАЙ ВУЧЭБНАЙ РАБОТЫ СТУДЭНТАЎ

Перабудова вышэйшай педагагічнай адукацыі і пераход на шматузроўневую сістэму навучання прадугледжвае не толькі перагляд зместу, форм і метадаў работы са студэнтамі, але і істотныя змены ў суадносінах з разнастайнымі відамі іх дзейнасці.

Важнейшым састаўным элементам у вучэбна-пазнавальнай дзейнасці студэнтаў з'яўляецца правільная арганізацыя іх самастойнай работы.

Нават самая добрая лекцыя, падручнік не заўсёды поўна адлюстроўваюць змест разглядаемай праблемы, розныя падыходы да яе асвятлення. Менавіта таму авалоданне курсам немагчыма без вывучэння першакрыніц, вынікаў даследаванняў. Гэты працэс ажыццяўляецца студэнтамі самастойна ў пазааўдыторных занятках пад кіраўніцтвам выкладчыкаў.

Адным з накірункаў да ўдасканалення арганізацыі самастойнай работы з'яўляецца ўзбагачэнне яе зместу. Найбольш шырока выкарыстоўваюцца ў практычнай рабоце такія заданні, як канспектаванне літаратуры, напісанне рэфератаў, рашэнне педагагічных задач і сітуацый, напісанне кантрольных работ, анатаванне літаратуры, складанне слоўнікаў і г.д.

Аднак гэтыя традыцыйныя заданні, рашаючы цэлы шэраг важных у прафесійнай падрыхтоўцы будучых педагогаў задач, не зусім рэалізуюць творчы патэнцыял студэнтаў.

Арганізуючы самастойную работу студэнтаў, неабходна прадугледзець спалучэнне рэпрадуктыўнай і творчай дзейнасці, наяўнасць навізны, ускладненне ў рабоце. Гэта навізна павінна разглядацца не па знешніх прыкметах задання, а па ўнутранаму зместу самога працэсу пазнання, што выражаецца ў сістэматычным нарастанні цяжкасцяў, з якімі студэнты сустракаюцца пры выкананні самастойнай работы.

Для развіцця крытычнасці мыслення, умення адбіраць патрэбны матэрыял, аргументаваць свой пункт гледжання можна выкарыстоўваць такі прыём, як азнаямленне студэнтаў з крыніцамі, у якіх выказваюцца розныя пункты гледжання па адной праблеме, агляды часопісных артыкулаў па пэўнай тэматыцы, складанне схем, табліц, дыяграм, падрыхтоўка да дыскусій, спрэчак па кантрольных пытаннях.

Найбольш эфектыўнымі ў плане прафесійнай падрыхтоўкі будучых